

магілёўскі

Выбар

№ 4
Сакавік
2012 г.

Абласная Дэмакратычная Трыбуна

Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі



Лозунг Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) упершыню прагучаў у 1917 г. на Усебеларускім з'ездзе ў Менску. Незалежніцкія настроі ў беларускім руху ў значнай ступені былі выкліканы палітыкай Часовага ўрада Расеі, які не хацеў лічыцца з патрабаваннем беларускіх арганізацый аб наданні Беларусі статуса аўтаноміі ў складзе Расейскай дэмакратычнай федэратыўнай рэспублікі, а таксама палітыкай Савета Народных Камісараў Расеі, які вёў перагаворы з Германіяй аб лёсе Беларусі без удзелу ў іх прадстаўнікоў беларускага народа. Незалежніцкія тэндэнцыі ўзмацніліся пасля разгону Усебеларускага з'езда і пасля таго, як у студзені 1918 г. III Усерасейскі з'езд Саветаў ухваліў гэты разгон.

На тэрыторыі Беларусі, акупаванай Германіяй, ідэю незалежнасці ў 1915 г. пачала выпрацоўваць Беларуская сацыял-дэмакратычная работніцкая група (БСДРГ). Яна выказалася за стварэнне беларуска-літоўскай дзяржавы ў форме Канфедэрацыі Вялікага княства Літоўскага. У студзені 1918 г. у Вільні была праведзена Беларуская канферэнцыя. Пасля абвяшчэння незалежнасці Летувы (люты 1918) Віленская беларуская рада (ВБР), абраная на канферэнцыі, стала цалкам на незалежніцкія пазіцыі, але ўсё роўна не адмаўляла ідэю канфедэрацыі Беларусі і Летувы. 19.3.1918 г. ВБР абвясціла "сувязь паміж Расеяй і Беларусяй парванай" і звярнулася да заходніх дзяржаў з просьбай дапамагчы ў "справе адбудовы колішняга Літоўска-Беларускага гаспадарства".

Пасля таго як Л.Д. Троцкі сарваў мірныя перагаворы ў Брэсце, Германія 18.2.1918 г. пачала наступленне на ўсход. Аблвыкамзах і СНК Заходняй вобласці і фронту 19.2.1918 г. з Менску ўцяклі ў Смаленск. З турмы выйшлі дзеячы Цэнтральнай беларускай вайсковай рады (ЦБВР), якія навялі парадак у горадзе. Аднавіў сваю дзейнасць Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з'езда. 20.2.1918 г. ён прыняў 1-ю Устаўную грамату да народаў Беларусі і стварыў першы ўрад Беларусі - Народны Сакратарыят на чале з Язэпам Варонкам. ***(Пач. Прац. на стар. 2)***

МІХАІЛ КАХАНОВІЧ: МАГІЛЁЎЦЫ І НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ БЕЛАРУСІ

Мне прыйшлося пад час сусветнай вайны пражыць каля трох гадоў у Магілёве на Дняпры і быць сведкаю гістарычных падзей і здарэнняў у Царскай Стаўцы.

Пад гул раскатаў рэвалюцыі і акупацый магілёўскія беларусы сталі патроху гуртавацца і арганізоўвацца. Залажылі Беларускі Камітэт, у які адразу-ж пайшлі лепшыя сілы беларускай інтэлігенцыі, ня ўтраціўшай нацыянальнага пачуцця. Новай арганізацыі адразу-ж прышлося вытрымаць барацьбу з старажытнымі грамадзянскімі групіроўкамі, як, напрыклад, кадэцкая партыя, а з другога боку — з усерасійскімі рэвалюцыйнымі партыямі інтэрнацыянальнага толку, якіх расплядзілася тады шмат.

Адначасова Беларускі Магілёўскі Камітэт пашырыў сваю дзейнасць і на правінцыю. Залажыліся камітэты ў Воршы, Гомеле, Горках. Справа стала вырастаць і захапліваць людзей з правінцыі.

У канцы красавіка 1918 году атрымалі весткі з Менску, што Беларуская Рада абвясціла незалежнасць Беларусі. Мы, магілёўцы, сталі абгаварываць паміж сабою пытанне, якім спосабам зрабіць, каб абвешчанне незалежнасці Беларусі адсвяткаваць у Магілёве найбольш урачыста.

І вось прыйшоў дзень, здаецца, 12 ліпеня 1918 году. У абшырную залу суда а шостай гадзіне вечару сталі прыбываць прадстаўнікі ўсіх магілёўскіх установаў і арганізацый: ад земства губерскага, павятовага, ад мясцовай думы, ад нацыянальных, прафесіянальных, культурна-прасветных і палітычных арганізацый.

(Пачатак. Закан. на стар. 6)

Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі

(Працяг. Пач. на стар. 1)



Герб БНР

Хоць Выканком Рады Усебеларускага з'езда і аб'явіў сябе часовай уладай на Беларусі, фармальна беларуская дзяржава абвешчана не была. У Выканкоме строга прытрымліваліся рэзалюцыі Усебеларускага з'езда, паводле якой Беларусь павінна была ўваходзіць у склад Расейскай дэмакратычнай рэспублікі як аўтаномная адзінка з рэспубліканскім ладам.

Незалежніцкія тэндэнцыі ў беларускім руху ўзмацніліся пасля падпісання і ратыфікацыі Савецкай Расеяй Брэсцкага міру 1918 г. Бальшавікі парушылі дадзенае Троцкім у час работы Усебеларускага з'езда абяцанне, што лёс Беларусі не будзе вырашацца без удзелу яе прадстаўнікоў. 9.3.1918 г. Выканком Рады Усебеларускага з'езда прыняў 2-ю Устаўную грамату да народаў Беларусі. Цяпер краіна фармальна абвяшчалася Беларускай Народнай Рэспублікай. Закладваўся канстытуцыйны лад яе як дэмакратычнай дзяржавы. Уся паўната ўлады перадавалася Радзе Усебеларускага з'езда. У гэтым акце нічога не гаварылася пра адносіны БНР з іншымі дзяржавамі. 18.3.1918 г. Рада Усебеларускага з'езда была пературорана ў Раду БНР. Антон Луцкевіч прапанаваў Народнаму Сакратарыяту абвясціць незалежнасць БНР.

25.3.1918 г. была прынята 3-я Устаўная Грамата (яе тэкст датаваны 24.3.1918). З гэтага часу Беларусь абвяшчалася незалежнай і свабоднай дзяржавай, якая ўзаконіла заваёвы Лютаўскай і часткова (перадача зямлі сялянам без выкупу) Кастрычніцкай рэвалюцый у Расеі.

Незалежнасць БНР не адпавядала інтарэсам суседніх дзяржаў. Германія разглядала Беларусь як акупаваную расейскую тэрыторыю і заклад пад кантрыбуцыю, якую ёй абавязалася выплаціць РСФСР. Яшчэ 25.2.1918 г. нямецкія салдаты занялі будынак Народнага Сакратарыята, знялі з яго беларускі сцяг, у самім памяшканні зрабілі вобыск і забралі касу. Пасля абвяшчэння незалежнасці Беларусі германскія акупацыйныя ўлады пад пагрозай зброі разагналі Раду і Народны Сакратарыят, але іх сяброў не арыштавалі. У гэтых умовах урад БНР пачаў ствараць беларускі камандны склад, прызначыў Кастуся Езавітава спецыяльным камісарам для ваенных спраў і абвясціў аб узбраенні грамадзян. У пачатку красавіка 1918 г. нямецкія акупацыйныя ўлады заявілі, што яны забараняюць дзейнасць Народнага Сакратарыята.

Паводле сваіх сацыяльных поглядаў у апазіцыі да Рады і Народнага Сакратарыята знаходзіліся дзеячы "Менскага беларускага прадстаўніцтва", якія выступалі супраць нацыяналізацыі зямлі і за беларуска-германскае збліжэнне. Рада і Народны Сакратарыят, вымушаныя знешнімі абставінамі, пайшлі на аб'яднанне з імі. 12.4.1918 г. у склад Рады БНР былі каптаваны сябры "Менскага беларускага прадстаўніцтва" на чале з Паўлам Алексюком, Раманам Скірмунтам і Аляксандрам Уласавым.



Паштовая марка БНР

Карыстаючыся тым, што нямецкія акупацыйныя ўлады не спынялі варожай дзейнасці ў дачыненні да Рады, Аляксюк, Скірмунт і іншыя дамагаліся свайго. 25.4.1918 г. на імя кайзера Вільгельма II была накіравана тэлеграма, якую, акрамя іх, падпісалі таксама старшыня Рады БНР Іван (Янка) Серада, старшыня Народнага Сакратарыята Язэп Варонка, сябры Рады Антон Аўсянік, Пётра Крачэўскі і Язэп Лёсік. Падпісаныя ад імя ўсёй Рады заявілі, што добрую будучыню Беларусі яны бачаць "толькі пад апекай германскай дзяржавы". Гэта з'явілася штуршком да расколу Беларускай Сацыялістычнай грамады (БСГ) і крызісу ўрада БНР. У пачатку мая 1918 г. з урада БНР выйшлі сацыяліст-дэмакрат А.А. Смоліч, сацыялісты-рэвалюцыянеры Палута Бадунова, Тамаш Грыб і Лявон Заяц. Была створана часовая Рада пяцёх, у склад якой увайшлі сацыялісты-федэралісты на чале з Я. Варонкам. Выкарыстаўшы адсутнасць у Менску значнай часткі сяброў Рады БНР - сацыялістаў, правыя здолелі адхіліць Раду пяцёх і стварыць новы ўрад БНР на чале са Скірмунтам. Такім чынам з'явіліся два ўрады БНР. Гэта выклікала абурэнне левых. У чэрвені на пленарным пасяджэнні Рады БНР быў створаны кааліцыйны ўрад на чале з Я. Серадой, у які ўвайшлі правыя і левыя. Старшынёй Рады БНР стаў Я.Ю. Лёсік.

Рада і Народны Сакратарыят БНР прыкладалі намаганні для арганізацыі беларускіх нацыянальных інстытутаў у цэнтры і ў правінцыі. 27.3.1918 г. была абвешчана пастанова Рады пра тое, што яна бярэ ўсю паўнату ўлады ў краіне. 20.4.1918 г. прыняты наказ мясцовым беларускім радам аб асновах выбараў у сельскія, валасныя, павятовыя, местачковыя, гарадскія і губернскія рады, якія павінны былі пераняць ад акупацыйных улад кіраванне пэўнымі галінамі гаспадарчага і культурнага жыцця. Пасля таго, як у Радзе і Нацыянальным Сакратарыяце БНР умацаваліся пазіцыі правых, палешпыліся адносіны да гэтых органаў з боку камандавання 10-й арміі рэйхсвера, якая дыслацыравалася на тэрыторыі Беларусі, хоць берлінскі ўрад па-ранейшаму ставіўся да БНР адмоўна.

(Працяг на стар. 3)

Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі

(Працяг. Пач. на стар. 1-2)

27.5.1918 г. камандуючы 10-й арміяй генерал Э. Фалькенгайн прыняў прадстаўнікоў Рады і Народнага Сакратарыята. Каб змягчыць адносіны паміж акупантамі і насельніцтвам, ён хацеў бачыць у асобе Рады пасрэдніка паміж нямецкімі ўладамі і беларускім народам. Дзеля дасягнення гэтай мэты 21.6.1918 г. нямецкае камандаванне дало, у прыватнасці, згоду па ўтварэнне пры павятовых камендатурах інстытутаў дарадчыкаў. Пасля таго як у чэрвені 1918 г. урад БНР аб'явіў нядзейнымі на тэрыторыі рэспублікі дэкрэты і пастановы ўрада РСФСР, акупацыйныя ўлады перадалі ў кампетэнцыю Народнага Сакратарыята гандаль, прамысловасць, сацыяльную апеку, асвету і культуру.

Найбольшых поспехаў БНР дасягнула ў развіцці асветы і культуры. Пасля абвяшчэння БНР Народны Сакратарыят прыняў пастанову аб дзяржаўным статусе беларускай мовы. У Менску працавала беларуская гімназія на чале з дырэктарам У.І. Самойлам. Падрыхтоўка настаўнікаў вялася ў Менскім педагагічным інстытуце, у якім выкладалі В.Л. Іваноўскі, У.М. Ігнатоўскі, Я.Ф. Карскі і іншыя. Для перападрыхтоўкі настаўнікаў працавалі курсы беларусазнаўства заснаваныя 3.4.1918 г. у Менску. Лекцыі тут чыталі Варонка, Грыб, Ігнатоўскі, Лёсік, Смоліч і іншыя. У красавіку 1918 г. заснавана Менская вышэйшая музычная школа, якая ў тым жа годзе была перайменавана ў Беларускую кансерваторыю. Была адкрыта таксама каталіцкая духоўная семінарыя. Рэктар яе - доктар філасофіі ксёндз Ф. Абрантовіч. У красавіку 1918 г. створана падрыхтоўчая камісія для адкрыцця Беларускага універсітэта ў Менску. У планах урада БНР было таксама адкрыццё сельскагаспадарчага і політэхнічнага інстытутаў. Пры ўрадзе БНР былі заснаваны бюро для падрыхтоўкі падручнікаў і выдавецтва "Прасвета". Друкаванне падручнікаў пачалося у 1915 г. выдавецтвамі Беларускага народнага камітэта і Вацлава Ластоўскага. Па ініцыятыве Івана Луцкевіча ў 1918 г. створана першая беларуская навуковая ўстанова - Беларускае навуковае таварыства ў



Першы ўрад БНР - Народны Сакратарыят: (злева направа, сядзяць) Алесь Бурбіс, Іван Серада, Язэп Варонка (старшыня), Васіль Захарка; (стаяць) Аркадзь Смоліч, Пётра Крэчэчўскі, Кастусь Езавітаў, Антон Аўсянік, Лявон Заяц

Вільні. На аснове калекцый І.І. Луцкевіча ў Вільні і Менску была праведзена першая мастацкая выстаўка. Аднаўляла сваю дзейнасць Беларускае выдавецкае таварыства. Працавалі таксама выдавецтвы Народнага Сакратарыята БНР, выдавецкія таварыствы "Бацькаўшчына", "Крыніца". Пачалі выходзіць і газеты. Пад апекай урада БНР працавала створанае Ф. Ждановічам Першае таварыства беларускай драмы і камедыі з хорам (кіраўнік У.В. Тэраўскі), аркестрам народных інструментаў (кіраўнік З. Захар) і танцавальнай групай, якую ўзначальваў Ч.І. Родзевіч, а таксама "Беларуская хатка", дзе ладзіліся спектаклі і канцэрты. 19.5.1918 г. на Ляхаўцы ў Менску быў адкрыты Беларускі народны дом імя М. Багдановіча, які стаў сядзібай Беларускага дзяржаўнага тэатра БНР, утворанага на базе Першага таварыства беларускай драмы і камедыі. У БНР разгортваўся масавы культурна-асветны рух.

Народны Сакратарыят дамагаўся міжнароднага прызнання БНР. У чэрвені 1918 г. дэлегацыю БНР на чале са Скірмунтам наведала з візітам Кіеў. Урад Украіны прызнаў беларускую дзяржаву. Консульства было адкрыта таксама ў Летуве. Консульскія функцыі ў Маскве выконваў А.Л. Бурбіс. Дыпламатычныя місіі былі накіраваны таксама ў Варшаву, Берлін, Берн, Капенгаген. Грамадзяне БНР атрымлівалі пашпарты, у тым ліку дыпламатычныя. Дзейнічалі беларускія прэс-бюро і карэспандэнцкія пункты.

У 1918 г. у якасці дзяржаўных былі ўзаконены бела-чырвона-белы сцяг і герб "Пагоня". У 1919 г. М. Касцевіч (Макар Краўцоў) напісаў ваяцкі марш "Мы выйдзем шчыльнымі радамі...", які ў 1920 г. стаў гімнам БНР.

Поспехі ў дзяржаўным кіраўніцтве былі абмежаваныя, таму што Германія замінала развіццю беларускай дзяржаўнасці.

Няўдачы Германіі, магчымы хуткі прыход бальшавікоў штурхнулі да Рады БНР прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей, іх правых партый. У канцы верасня 1918 г. у склад Рады ўвайшлі выбарныя прадстаўнікі ад праваслаўнага духавенства, Менскага праваслаўнага брацтва, польскай нацыянальнай меншасці і рускіх кадэтаў. Рускія сацыялісты і Бунд пераней шаму выступалі супраць Рады. Абставіны патрабавалі, каб на чале ўрада стаў вядомы ў шырокіх колах чалавек. Старшынёй Народнага Сакратарыята быў прызначаны А.І. Луцкевіч. 11.10.1918 г. Рада зацвердзіла часовую канстытуцыю БНР. Народны Сакратарыят быў перайменаваны ў Раду Народных Міністраў.

(Працяг на стар. 4)

Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі

(Працяг. Пач. на стар. 1-3)

Яе ўзначаліў А.І. Луцкевіч, які меў таксама мандат міністра замежных спраў. У пачатку лістапада 1918 г. ён наведаў Маскву. Урад Луцкевіча гатовы быў увесці ў Беларусі савецкую канстытуцыю і ўстанавіць з РСФСР федэратыўную сувязь пры ўмове, што Савецкая Расея прызнае незалежнасць БНР. Урад Леніна не пагадзіўся з прапановамі Луцкевіча. Пасля Лістападаўскай рэвалюцыі ў Германіі, калі Расея дэнансавала Брэсцкі мірны дагавор, урад БНР звярнуўся да Антанты з просьбай увесці на Беларусь міжнародныя войскі. Адказу ён не атрымаў. 28.11.1918 г. адбылося апошняе ў гэтым годзе пасяджэнне Рады БНР у Менску. Была прынята Грамата з заклікам ствараць беларускія Рады сялянскіх і рабочых дэпутатаў. 3.12.1918 г. сябры Рады і ўрада БНР пераехалі ў Вільню. Наступленне Чырвонай арміі вымусіла кіраўніцтва БНР 27.12.1918 г. пераехаць у Гродна. Гэты горад лічыўся сталіцай БНР да верасня 1919 г., пакуль Рада БНР не вярнулася ў Менск. Асноўны кірунак дзейнасці Урада БНР у гэты час - барацьба супраць прэтэнзій Польскай дзяржавы на беларускія тэрыторыі і супраць прызыву беларусаў у Войска Польскае.

У красавіку 1919 г. Войска Польскае захапіла Вільню і Гродна. У Вільні Ю. Пілсудскі апублікаваў адозву да жыхароў былога Вялікага княства Літоўскага, у якой абяцаў, што ніякага націску з боку Польшчы не будзе, што народ сам вырашыць свае ўнутраныя справы - нацыянальныя і рэлігійныя. 8.8.1919 г. Войска польскае ўвайшло ў Менск. Пілсудскі выдаў новую адозву, у якой абяцаў, што Польшча і Беларусь будуць ладзіць свае адносіны як роўны з роўным, як вольны з вольным. У пачатку верасня 1919 г. у Менск пераехалі старшыня Рады БНР Лёсік, яго намеснік Смоліч, іншыя дзеячы. 18.9.1919 г. у Менск прыехаў Пілсудскі. Ён быў прывітаны ўсімі беларускімі партыямі, акрамя бальшавікоў. 19 верасня Лёсік і Смоліч накіравалі Пілсудскаму ліст, у якім прасілі яго згоды на аднаўленне працы Рады БНР, на паступовую перадачу цывільнай улады ўраду БНР, а таксама на арганізацыю беларускага войска.



Шыльда вайскова-дыпламатычнай місіі БНР у Рызе

Тое, што беларускія партыі віталі адозву Пілсудскага і яго самога, тлумачыцца таксама антыбеларускай палітыкай бальшавікоў. У час Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ) і Літоўска-Беларускай ССР (Літбела) ва ўсіх беларускіх школах была ўведзена руская мова навучання, беларускія газеты не выходзілі. Ва ўрад Літбела бальшавікі не дапусцілі ніводнага беларуса. У сакавіку 1919 г. ад Літбела былі адарваны і перададзены ў склад Расеі Дзісенскі і Рагачоўскі паветы, а 16.7.1919 г. прынята пастанова аб роспуску ўрада Літоўска-Беларускай ССР. Такім чынам, бальшавікі ліквідавалі нават прывідную беларускую савецкую дзяржаўнасць.

Ў канцы жніўня 1919 г. па запрашэнні прэм'ер-міністра Польшчы Падарэўскага старшыня Рады Народных Міністраў БНР А.І. Луцкевіч выехаў з Парыжа ў Варшаву. 1 верасня Луцкевіч прыехаў у Варшаву, аднак прэм'ер-міністр Польшчы з ім не сустрэўся. Толькі 22.10.1919 г. яго прыняў Пілсудскі. Ён раіў беларускаму прэм'еру ператварыць Раду БНР у Беларускую Нацыянальную Раду, заняцца школьніцтвам і г.д. Луцкевіч жа хацеў, каб Пілсудскі прызнаў права Беларусі на дзяржаўную самастойнасць. Сустрэча не дала практычных вынікаў.

1.12.1919 г. Луцкевіч, В.І. Захарка, Крачэўскі і іншыя сябры ўрада БНР прыехалі ў Менск. Сацыялісты-рэвалюцыянеры і сацыялісты-федэралісты абвінавачвалі сацыял-дэмакратычнае кіраўніцтва рэспублікі ў згодніцтве і здрадзе. 13.12.1919 г. адбыўся раскол Рады БНР на Найвышэйшую Раду БНР і Народную Раду БНР. Іх старшынямі сталі адпаведна сацыял-дэмакрат Лёсік і сацыял-федэраліст Крачэўскі. Былі створаны два ўрады БНР. Найвышэйшая Рада на чале кабінета пакінула А.І. Луцкевіча, Народная Рада прызначыла кіраўніком кабінета Ластоўскага. Польскія ўлады распарадзіліся аб разгоне Народнай Рады за ўзурпацыю паўнамоцтваў. Ластоўскага, Бадунова, Мамоньку кінулі ў астрог. Гэта выклікала абурэнне беларускай грамадскасці. Убачыўшы, што польскі ўрад не здольны прызнаць права Беларусі на дзяржаўную самастойнасць, 28.2.1920 г. А.І. Луцкевіч пакінуў пасаду старшыні Рады Народных Міністраў. Раней з Менску ў Берлін тайна выехалі старшыня Народнай Рады БНР Крачэўскі і яго намеснік Захарка. Толькі ў маі 1920 г. атрымалі дазвол выехаць з Менску ў Рыгу Ластоўскі, Бадунова, Грыб, Мамонька.



Паштовая марка БНР

Перыяд паміж жніўнем 1919 г. і ліпенем 1920 г. адзначаны ажыўленнем беларускай культурна-асветнай работы. Працягваў дзейнічаць Менскі педагагічны інстытут. З друку выйшлі новыя падручнікі і дапаможнікі, у тым ліку "Кароткі нарыс гісторыі Беларусі" Ігнатоўскага, "Гісторыя беларускае літаратуры" М. Гарэцкага, "Геаграфія Беларусі" Смоліча. Было заснавана Менскае асветнае выдавецтва. У 1919-1920 гг. выходзілі ў Менску газеты "Звон" і "Беларусь", часопісы "Беларускае жыццё", "Рунь".

(заканчэнне на стар. 5)

Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі

(Заканчэнне. Пач. на стар. 1-4)

Быў адноўлены сельскагаспадарчы часопіс "Саха". Устанавіла сваю працу ў "Беларускай хатцы" трупа Ф. Аляхновіча разам з хорам Тэраўскага. На аснове гэтых калектываў былі створаны Менскае таварыства працаўнікоў беларускага мастацтва і тэатр. У снежні 1919 г. аднавіў свае спектаклі Беларускі дзяржаўны тэатр, перайменаваны ў Беларускі нацыянальны тэатр. У кастрычніку 1919 г. Беларуская вучнёўская грамада стварыла пры тэатры Менскае таварыства працаўнікоў мастацтва, сваю драматычную секцыю, якая мела ўласны рэпертуар. Працавалі шматлікія беларускія гурткі мастацкай самадзейнасці. Міністэрства асветы БНР выпусціла для аматарскіх тэатраў зборнікі п'ес.

У 1919-1920 гг. БНР дэ-юрэ або дэ-факта прызналі Германія, Латвія, Летува, Эстонія, Чэхаславакія, Балгарыя, Фінляндыя, Турцыя. У гэтых краінах працавалі беларускія дыпламатычныя і вайскова-дыпламатычныя місіі, консульствы і прадстаўніцтвы.

У канцы 1919 г. бальшавікі зразумелі, што ігнараваць нацыянальныя запатрабаванні беларусаў нельга. Гэта і тое, што ў саюзе з бальшавікамі змагаліся партызанскія атрады Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПС-Р) і Беларускай камуністычнай арганізацыі (БКА), вымусіла польскія кіруючыя колы пачаць у сакавіку 1920 г. перагаворы з Найвышэйшай Радай БНР.

Польская камісія, якая прыехала ў Менск, адхіліла 15 з 28 патрабаванняў Найвышэйшай Рады. На патрэбы беларускай школы і культуры замест абяцаных 30 млн. марак было асігнавана 10,7 млн. Дзейнасць Беларускай вайсковай камісіі (БВК) была практычна сабатавана польскімі ўладамі і некаторымі сябрамі камісіі. У чэрвені 1920 г. Найвышэйшая Рада патрабавала прызнаць незалежнасць БНР і да склікання Устаноўчага сойма аддаць Беларусь пад пратэктарат Лігі Нацый. Гэту прапапову падтрымліваў А.І. Луцкевіч, які знаходзіўся тады ў Вільні. Ён хацеў выехаць у Парыж, але палякі зноў не далі яму гэтага зрабіць.

Паралельна ўрад Ластоўскага



шукаў кантакт з урадам РСФСР. Разглядаючы яго як саюзніка ў антыпольскай барацьбе, наркамат замежных спраў РСФСР запрасіў дэлегацыю ўрада ў Маскву. Яе ўзначаліў Захарка. 4.7.1920 г. пачалося наступленне Чырвонай арміі на Заходнім фронце. Праз тыдзень яна ўступіла ў Менск. 12 ліпеня ўрад РСФСР заключыў дагавор з Летувой, паводле якога значная частка беларускіх зямель передавалася ў яе склад. Гэта выклікала абурэнне і Найвышэйшай, і Народнай Рад. Надзея на тое, што БНР будзе прызнана Савецкай Расеяй, знікла. У адказ на гэта беларускія эсэры, якія супрацоўнічалі з КП(б)ЛіБ, БКА, Бундам і прафесійнымі саюзамі, адмовіліся падпісаць Дэкларацыю аб абвяшчэнні незалежнасці Беларускай ССР. Яны патрабавалі абвясціць поўную незалежнасць Беларусі ў яе этнічных межах, стварыць самастойнае беларускае войска і кааліцыйны сацыялістычны ўрад Беларусі. 20.10.1920 г. у Рызе адбылася палітычная канферэнцыя, у якой удзел узялі сацыялісты-рэвалюцыянеры, сацыялісты-федэралісты і прадстаўнік сацыял-дэмакратаў Аўсянік. Было вырашана стварыць вакол урада Ластоўскага адзіны нацыянальны блок. Сябар Прэзідыума Найвышэйшай Рады БНР К. Цярэшчанка ад яе імя прызнаў Народную Раду адзіным паўнамоцным прадстаўніком беларускага народа. Ад гэтага часу Народная Рада стала называцца Радай БНР.

Беларускія сацыялістычныя партыі разглядалі Польскія і расейскія войскі ў Беларусі як акупацыйныя. 11.11.1920 г. быў заключаны дагавор паміж БНР і Летувіскай Рэспублікай аб узаемным прызнанні, аб супрацоўніцтве і супольнай барацьбе за вызваленне беларускіх і літоўскіх зямель з-пад польскай акупацыі. Прэзідыум Рады БНР і ўрад Ластоўскага пераехалі ў сталіцу Летувы Коўна. У гэты час урад ставіў сваёй мэтай зрыў савецка-польскіх перагавораў у Рызе. Урадам краін Антанты, Балтыі, Скандынавіі, а таксама ўраду Германіі да сярэдзіны лютага 1921 г. было накіравана 26 мемарандумаў і дэкларацый. Адзінае, што далі намаганні ўрада БНР і яго дыпламатычных прадстаўнікоў, гэта тое, што Парыжская мірная канферэнцыя (студзень 1919 - студзень 1920) паставіла Польшчы ў абавязак паважаць правы нацыянальных меншасцей і запісаць адпаведнае палажэнне ў канстытуцыю Польскай Рэспублікі.

Такім чынам, нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, першая спроба ўтварэння беларускай дзяржаўнасці мела вялікае гістарычнае значэнне. Абвяшчэнне незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі і дзейнасць яе Рады зрабілі ўплыў на развіццё нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа. Не дабіўшыся ўлады, Рада БНР тым не менш прымусіла бальшавікоў пераглядзець сваю палітыку ў адносінах да беларусаў.

А.М. Сідарэвіч

НА МАГІЛЁЎШЧЫНЕ АДЗНАЧАЦЬ ДЗЕНЬ ВОЛІ



У большасці дэмакратычных арганізацый і суполак Магілёва і вобласці пройдуць розныя імпрэзы і вечарыны, прысвечаныя Дню Волі. У іх разам з актывістамі дэмакратычнага руху прымуць удзел гісторыкі, што распавядуць аб падзеях таго далёкага, але надзвычай важкага для гісторыі Беларусі, 1918 года. Таксама сваімі думкамі па актуальных праблемах нацыянальнага Адраджэння падзеляцца сучасныя ўдзельнікі мірнага змагання за незалежнасць краіны і яе дэмакратычнае цывілізаванае развіццё, якія пазналі і пазнаюць за сваю пазыцыю з боку ўладаў самыя разнастайныя меры пераследу і пакарання. Актывісты ў Магілёве і раёнах наведаюць таксама знакавыя мясціны нацыянальнай незалежніцкай гісторыі і могілкі людзей, што ўвайшлі ва ўдзячны мемарыяльны спіс беларускіх патрыётаў. Дзень Волі ў большасьці дэмакратычных арганізацый і суполак традыцыйна скончыцца сяброўскімі вечарынамі.

Віктар Войт

МІХАІЛ КАХАНОВІЧ: МАГІЛЁЎЦЫ І НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ БЕЛАРУСІ



Будынак у Магілёве (цяпер гэта краязнаўчы музэй), у якім на сходзе ухвалілі незалежнасць БНР

(Заканч. Пачатак на стар. 1)

Усяго сабралася да 400 прадстаўнікоў. На павестцы дня стаяў адзін толькі пункт — аб незалежнасці Беларусі.Пасля досыць доўгіх дэбатаў пытанне пастаўлена было на балатыроўку і прайшло абсалютнаю большасцю ўсіх процiў дзвюх, пры дзевяці ўстрымаўшыхся. Такога выніку ніхто з нас, магілёўскіх родных-беларусаў, не чакаў. Гэта быў поўны трыумф нашае палітыкі. Магілёў моцна падтрымаў Менскую ўхвалу 25 сакавіка.

Часопіс “СПАДЧЫНА” №6, 1997

Даведка “МВ”:

Міхаіл Кахановіч (1884-1934) – беларускі палітычны і грамадскі дзеяч. Выкладаў гісторыю, з’яўляўся сябрам Расейскага геаграфічнага таварыства. У часы рэвалюцыі 1917 года жыве ў Магілеве, узначальвае губернскі Беларускі нацыянальны камітэт. Потым пераязджае ў Літву, становіцца першым дырэктарам Віленскай Беларускай гімназіі (1919-1922 гг). У 1925 г. вырашыў вярнуцца на Беларусь. У БССР працуе ў Белдзяржвыдавецтве, займаецца перакладамі. У 1933 г. арыштаваны ГПУ, у 1934 г. расстраляны.

Магілёўцы патрабуюць ад Лукашэнкі выбачыцца за ганебныя паводзіны

У Магілёве зьбіраюць подпісы пад зваротам да прэзыдэнта Беларусі, а таксама ў Палату прадстаўнікоў, з патрабаваньнем спыніць палітыку канфрантацыі з краінамі Эўрапейскага Зьвязу.

Ініцыяваў збор подпісаў актывіст незалежнага прафсаюзу работнікаў радыёэлектроннай прамысловасьці Аляксей Паўлоўскі. Як ён заяўляе, некалькі дзясяткаў падпісных лістоў з амаль 600 подпісамі дасланыя адрасатам.

Нагодай для звароту, кажа Паўлоўскі, сталася высылка афіцыйнымі ўладамі зь Беларусі амбасадараў Польшчы й Эўрапейскага зьвязу.

Зварот патрабуе спыніць «канфрантацыю з цывілізаванымі дзяржавамі і выбачыцца за ганебныя паводзіны». Падпісанты звароту заклікаюць уладу ў Беларусі вызваліць усіх палітзьняволеных, а таксама пазбавіць пасадаў чыноўнікаў, якія ўдзельнічалі ў фальшаваньні вынікаў выбараў. Гэта, на іх думку, палепшыць палітычны й эканамічны клімат у Беларусі.

«Беларусь зможа атрымаць тэхналягічную і эканамічную дапамогу ад перадавых эўрапейскіх дзяржаваў, што паспрыяе росту дабрабыту грамадзян краіны, спыніцца рост цэнаў і зьбядненьне народу», гаворыцца ў звароце.

Радыё Свабода

Зарплата белорусов не дотягивает до уровня прошлого года

Согласно данным, размещенным на сайте Национального статистического комитета, реальные располагаемые денежные доходы населения Беларуси в январе 2012 года составили 93,5% к уровню января 2011-го и 83,7% к уровню декабря 2011 года.

Реальная заработная плата работников Беларуси (без субъектов малого предпринимательства негосударственной формы собственности) в январе нынешнего года составила 97,3% к январю 2011-го и 98,2% к декабрю 2011 года.

эканоміка

Василий Леонов: В стране не рынок и не социализм, а бандитизм!



Василий Леонов

Василий Севастьянович Леонов личность в Беларуси известная. Окончил Белорусский институт механизации сельского хозяйства. Работал инженером в колхозе. Был первым секретарем Могилевского обкома КПБ, министром сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь, одним из первых белорусских политических заключенных.

Поводом к разговору с Василием Севастьяновичем послужил тот факт, что ветеринарная и фитосанитарная служба Украины с 1 марта 2012 года приостановила ввоз на территорию Украины молока и молочных продуктов из Республики Беларусь. Официальная причина запрета - существенное превышение остатков ветеринарных препаратов, вводимых тамошним коровам. Речь, в основном, об антибиотиках в белорусском молоке, сухом молоке, сыре и других продуктах, пишет сайт Ex-press.by.

Первый заместитель главы Госветфитослужбы Владимир Горжеев заявил, что Беларусь, начиная с октября 2011 года, систематически нарушает украинское законодательство, поставляя загрязненную продукцию. По его словам, неоднократные официальные обращения с просьбой устранить нарушения остались без внимания, в связи с чем украинские ветеринары были вынуждены ввести санкции. Владимир Горжеев также добавил, что запрет введен на все белорусские молочные продукты, так как нарушение является систематическим.

- Господин Леонов, Вы белорусское сельское хозяйство знаете не понаслышке. Что же происходит в некогда весьма успешной отрасли республики?

- Если говорить откровенно, то сельское хозяйство страны скоро с потрохами сдадут россиянам. Говорю это осознанно, видя подход к этой важнейшей отрасли хозяйствования здесь и там.

- Вы хотите сказать, что сельхозпроизводство Беларуси, в которое закачиваются триллионы белорусских рублей, не выдержит конкуренции даже с Россией?

- Наверняка не выдержит! Скоро мы к этому подойдем и почувствуем на себе. Пока что и мясо, и молоко у нас не дороже российских продуктов, но это явление временное. Еще в этой пятилетке вслед за «Белтрансгазом» и другими ликвидными производствами, включая «Беларуськалий» и железную дорогу, будет потеряна и сельскохозяйственная отрасль.

- Полагаете, что земля перестанет родить?

- Дело не в земле, а в том, что к ней надо приложить и труд, и мозги, и деньги, только тогда будет отдача. К слову сказать, после войны урожайность в БССР была семь центнеров зерна с гектара. Белорусские большевики подняли ее до 25-ти. Это произошло в результате и грамотного применения удобрений, и мелиорации и всех остальных технологий.

- То есть, по-Вашему, мы сейчас проедаем то, что вложили в село коммунисты?

- И делаем это с большим успехом, несмотря на огромные вложения в отрасль. Выше я говорил о том, что кроме труда и денег в этом деле нужны еще и мозги.

- Говорят, что уже почти два десятка лет отрасль ежегодно дотируется на два с половиной триллиона белорусских рублей. Куда такие деньги тратятся?

- Это, смотря в какую топку бросать…

- Сейчас начались проблемы с поставкой молока в соседнюю Украину. Продукт не проходит по качеству. Говорят о завышенном количестве в нем антибиотиков. Как это понять?

- В первую очередь следует посмотреть на корма. Сейчас стало модным, чтобы привесы и надои росли, применять всякие биодобавки и прочую химию. Коровы ведь часто болеют, их лечат, делают уколы и все это идет в молоко. Его по технологии следует в дальнейшее производство не пускать, но кто ж так у нас делает? И еще, поинтересуйтесь, какова бактериальная обсемененность молока, то есть уровень соблюдения гигиены при дойке, транспортировке, хранении. Тут полный мрак - грязь, коровьи, извините, испражнения и прочие не улучшающие качества продукта ингредиенты.

Справка. Для потребителя молоко является качественным, если оно не только имеет высокую пищевую ценность, но и безопасно, то есть не содержит ни опасных бактерий, ни антибактериальных препаратов. Основными показателями, характеризующими качество молока, являются: содержание жира, бактериальная обсемененность; содержание белка, содержание соматических клеток, наличие ингибиторов, точка замерзания, алкогольная проба, термоустойчивость. Бактериальная обсемененность - это количество микроорганизмов в 1 см3 молока. В молоке могут содержаться бактерии, дрожжи и плесневые грибки. Они попадают в молоко при доении из внешней среды. Повышенная бактериальная обсемененность - результат несоблюдения правил гигиены при производстве молока и его хранении. По европейским стандартам показатель бактериальной обсемененности в сыром продукте не должен превышать 100 тыс. в 1 см3. В РБ - в три раза выше, но и эта норма часто не соблюдается. Высокая бактериальная загрязненность приводит к ухудшению вкуса, снижению питательной ценности сырого молока и изготавливаемых из него продуктов, а также способствует значительному сокращению их срока хранения.

(Начало. Окон на стр. 8)

Посещение поликлиник может стать платным

Вице-премьер Анатолий Тозик предлагает брать за визит к врачу 5 тысяч рублей. Цель – сократить очереди в поликлиниках.

Такое предложение Анатолий Тозик высказал на итоговой коллегии Министерства здравоохранения, пишет «Звязда».

«У нас в среднем на одного жителя приходится более чем 13 посещений поликлиник в год, а в соседних странах совсем другая статистика - 6 или 6,5 посещений», - заявил вице-премьер.

И предложил такое решении проблемы: «Давайте введем плату в размере 5 тысяч рублей за посещение поликлиник». По его словам, если умножить эту сумму на средний показатель визитов к врачам, то в год получится не так много. Зато, по мнению Тозика, «кого-то даже такая символическая плата, возможно, заставит задуматься: а действительно ли нужно обращаться в поликлинику?».

И это страна с “бесплатным медицинским обслуживанием”?

Василий Леонов: В стране не рынок и не социализм, а бандитизм!

(Окончание. Нач. на стр. 7)

- Вот тебе и лозунг: «Покупайте белорусское!»…

- Скажу вам так: чтобы понять какое качество молока в стране, надо попробовать сыр. Это лакмусовая бумажка качества, тут все проявляется. Даже литовский сыр ныне лучше нашего. Проверьте! Голодная собака наш сыр есть не будет, я проверял! А это говорит о качестве исходного материала, то есть молока. Вот украинцы и не хотят брать плохой товар.

- Так что же со всем этим делать?

- Главное - отправить на пенсию Лукашенко, выбрать нового президента и, наконец-то, определиться, чем заниматься: то ли рынком, то ли социализмом? А сегодня у нас - бандитизм!

В Могилевской области «подняли» с дороги миллиард



На закрытом процессе Октябрьский суд Могилева рассматривает дело о хищении более миллиарда рублей в системе дорожного строительства.

Согласно данным следствия, обвиняемые, которых на скамье подсудимых девять человек, путем изменения состава асфальтно-бетонной смеси создавали излишки, которые впоследствии похищались. На скамье подсудимых пять должностных лиц — начальники дорожно-строительных управлений, а также представители коммерческих структур.

Как сообщил БелаПАН заместитель начальника отдела по надзору за законностью судебных постановлений по уголовным делам областной прокуратуры Денис Кичигин, в результате преступных действий ряду дорожно-строительных организаций области был нанесен ущерб в размере 1 млрд. 24 млн. рублей. В основном ущерб понесли могилевское дорожно-строительное предприятие № 3, предприятия “Могилевоблдорстрой” и “Могилевоблавтодор”.

Подсудимым вменяется в вину нарушение нескольких статей Уголовного кодекса. Большинство из них подозреваются в хищении путем злоупотребления и в присвоении или растрате вверенного имущества в крупных размерах.

Кроме того, в деле присутствует обвинение некоторых подсудимых в легализации доходов, полученных преступным путем.

По словам Кичигина, уголовное дело занимает 60 томов, более 200 человек проходят по нему как свидетели. Как утверждает заместитель начальника отдела, это первое уголовное дело такого большого объема. В то же время оно могло быть еще больше, поскольку изначально в нем фигурировали не девять, а около полутора десятка лиц. “В отношении некоторых лиц были приняты акты помилования ввиду возмещения ущерба, признания вины. Уголовное преследование в отношении них было прекращено”, — рассказал работник Могилевской областной прокуратуры.

Как отметил Кичигин, процесс был объявлен закрытым из-за того, что одному из подсудимых также вменяется в вину вовлечение в занятие проституцией.

Владимир ЛАПЦЕВИЧ

НА СЕЛЕ ИСЧЕЗАЮТ ФАПЫ

Последние десять лет на селе массово закрываются ФАПы (фельдшерско-акушерские пункты). Если в 2000 году их насчитывалось 2848, то в 2009 году уже 2425. А ведь это происходило не в самые тяжелые времена для экономики страны. Что тогда говорить о положении во время кризиса.

Несколько лет назад, в 2005 году объяснить закрытие медпунктов в сельской местности попытался лично Александр Лукашенко. Но его слова были далеки от оценки происходящего и больше напоминали похвальбу: «Сельчанин должен получить медицинское обслуживание не хуже городских жителей. И главное — мы можем это обеспечить. Запросто это можем сделать сегодня» (газета «Советская Белоруссия» - 31.5.2005).

Стоит ли удивляться, что процесс закрытия ФАПов продолжался и не заканчивается до сих пор. Например, раньше в Могилевской области было 450 фельдшерско-акушерских пунктов, а перед президентскими выборами 2010 года уже только 364 ФАПа. И вот прошёл всего год после выборов, когда нам опять обещали «запросто» сделать много полезного. За это время в области стало на 12 фельдшерско-акушерских пунктов меньше. Получается, что каждый месяц на селе закрывался один медицинский пункт.

МИХАИЛ ПЕТРОВ

магілёўскі **Выбар**

Грамадска-палітычная газета. Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна. Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі

Адрас рэдакцыі: Магілёўская воб, аг-к В. Машчаніца, вул. Савецкая, д.4. Тэл. 8 - 0259 204 308, e-mail: Boris152@gmail.com. Выдавец Міхайлаў Іван Барысавіч. Наклад: 299 асобнікаў, фармат А-4. Надрукавана на ўласным абсталяванні. Падпісана ў друк 14.03.2012 г. у 09-00.